# Бібліяграфічныя дапаможнікі па краязнаўстве

*В. І. Саітава*

Бібліяграфічная прадукцыя па краязнаўстве была важнай часткай папаўнення краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк і грамадства ў цэлым, бібліяграфічнага забеспячэння даследаванняў рэгіёнаў і населеных пунктаў, жыцця і спраў іх выдатных людзей, папулярызацыі краязнаўчых ведаў, выхавання патрыятызму, вырашэння сучасных праблем рэгіянальнага развіцця.

У стварэнні краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі ў выглядзе самастойных і несамастойных выдавецкіх форм прымалі ўдзел бібліятэкі, навуковыя ўстановы і асобныя вучоныя, ВНУ і інш. Значны ўклад унеслі абласныя ўніверсальныя навуковыя бібліятэкі і публічныя масавыя бібліятэкі. Адметнасцю гэтага перыяду было пашырэнне ўдзелу ЦБС у падрыхтоўцы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, далейшае павелічэнне несамастойных бібліяграфічных матэрыялаў, а таксама папаўненне бібліяграфічных і фактаграфічных баз даных.

Усведамляючы сваё месца ў рэгіянальным краязнаўчым руху, а таксама ролю ў сістэме інфармацыйных і сацыяльна-культурных цэнтраў рэгіёнаў, абласныя і публічныя масавыя бібліятэкі вызначылі кірункі падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў для дасягнення грамадска значных мэт. Абласныя бібліятэкі і многія ЦБС вялі бібліяграфічнае інфармаванне аб новай літаратуры, прысвечанай абласцям, раёнам і гарадам. Выйшаў шэраг рэтраспектыўных, галіновых, тэматычных і персанальных дапаможнікаў.

Абласныя бібліятэкі працягвалі падрыхтоўку ўніверсальных паказальнікаў новай літаратуры. Гэтыя паказальнікі выконваюць галоўную ролю ў бягучым інфармаванні даследчыкаў, спецыялістаў, кіраўнікоў і ўсёй грамадскасці аб новым дакументным патоку, па змесце прысвечаным абласцям. Адлюстроўваюцца розныя віды дакументаў: кнігі, матэрыялы з кніг, артыкулы са зборнікаў, часопісаў, газет, рэцэнзіі, ноты, карты, фотаздымкі і інш. З найбольшай паўнатой распісваюцца рэгіянальныя газеты, матэрыялаў з якіх няма ў "Летапісе газетных артыкулаў" і якія прадстаўляюць значны інтарэс для даследчыкаў. Бібліяграфічныя запісы дэталёва сістэматызаваны, уводзяцца новыя рубрыкі, выкарыстоўваюцца ўдакладняючыя анатацыі, пошук аптымізуюць шэраг дапаможных паказальнікаў. Актуальнай застаецца задача адлюстравання ў бягучых паказальніках новай літаратуры пра вобласці з замежнага друку, у якой асабліва зацікаўлены даследчыкі. З пункту гледжання забеспячэння даступнасці краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў важна працягваць выпуск друкаваных паказальнікаў новай літаратуры аб абласцях разам з прадастаўленнем электронных рэсурсаў. На жаль, у "Паказальніку бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі" зафіксаваны толькі выданні Віцебскай абласной бібліятэкі – "Віцебская вобласць" (3840 (2001 г.), 4238 (2002 г.), 4560 (2003 г.), 5257 (2004 г.), 3882 (2005 г., ч. 1)), Магілёўскай абласной бібліятэкі – "Новая літаратура аб Магілёўскай вобласці" (3844 (2001 г.), 4242 (2002 г.), 4563 (2003 г.), 5260 (2004 г.), 3885 (2005 г., ч. 1)) і Мінскай абласной бібліятэкі – "Літаратура аб Мінскай вобласці" (3842 (2001 г.), 4240 (2002 г.), 4562 (2003 г.), 5259 (2004 г.), 3884 (2005 г., ч. 1)), хоць выпускаюць падобныя паказальнікі і іншыя абласныя бібліятэкі.

Абласныя бібліятэкі і ЦБС працягваюць выпуск краязнаўчых календароў знамянальных і памятных дат. Некаторыя з іх носяць фактаграфічны характар (без спісаў літаратуры). Вельмі пажадана, каб фактаграфічная і бібліяграфічная інфармацыя выкарыстоўваліся для характарыстыкі дат і прыцягнення ўвагі спажыўцоў да крыніц іх дакументнага адлюстравання. Так, напрыклад, складаецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"Каляндар знамянальных і памятных дат па Магілёўскай вобласці" Магілёўскай абласной бібліятэкі (3840 (2001 г.), 4239 (2002 г.), 4561 (2003 г.), 5258 (2004 г.), 3883 (2005 г., ч. 1)). Менавіта класічныя метадычныя прыёмы падрыхтоўкі календароў памятных дат дазваляюць развіваць чытанне зыходзячы з узнікнення інтарэсу да рэгіянальных падзей.

Адметнасцю перыяду было з'яўленне двух універсальных рэтраспектыўных краязнаўчых дапаможнікаў, якія ў цэлым недастаткова прадстаўлены ў краязнаўчый бібліяграфічнай прадукцыі. Сектарам краязнаўства Магілёўскай абласной бібліятэкі падрыхтаваны "Указатель исторических материалов из "Могилевских губернских ведомостей" (1838–1898)" – 488 назв. (170 (2004 г.)) і "Сводный каталог литературы о Могилевской губернии" – 887 назв. (3887 (2005 г., ч. 1)). У першым з іх адлюстраваны матэрыялы з галоўнай газеты Магілёўшчыны ў XIX ст., прысвечаныя розным бакам жыцця края. Храналагічная групоўка бібліяграфічных апісанняў артыкулаў адпавядае гістарычнаму падыходу і асаблівасцям падрыхтоўкі паказальнікаў зместу газет. Імянны і геаграфічны дапаможныя паказальнікі дапамагаюць выявіць публікацыі ў патрэбным аспекце.

"Сводный каталог литературы о Могилевской губернии" (3887 (2005 г., ч. 1)) – першае ў беларускай краязнаўчай бібліяграфіі выданне, у якім прадстаўлены 887 дакументаў аб гістарычнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы, выдадзеных у перыяд яе існавання. Дакументы выяўлены па фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Прэзідэнцкай бібліятэкі, Цэнтральнай бібліятэкі НАН Беларусі, Фундаментальнай бібліятэкі БДУ, Магілёўскай абласной бібліятэкі і іншых крыніцах. Фондатрымальнікі, а таксама мікрафільмы пазначаны ўмоўнымі знакамі. Сярод адлюстраванай літаратуры многа выданняў, выдадзеных у Магілёве, што спрыяе папулярызацыі ведаў аб мінулым кнігавыдання ў краі. Алфавітная групоўка зрабіла відавочным уклад асобных аўтараў у вывучэнне губерні, напрыклад, П. С. Горючко апублікаваў 20 брашур, прысвечаных гісторыі царквы і пытанням адукацыі на Магілёўшчыне. Пашыраюць пошукавыя магчымасці імянны і геаграфічны дапаможныя паказальнікі. Уключыўшы ў дадзены выпуск літаратуру на рускай мове, сектар краязнаўства Магілёўскай абласной бібліятэкі, напэўна, неўзабаве прадставіць краязнаўцам і паказальнік замежнамоўнай літаратуры аб рэгіёне. Вопыт падрыхтоўкі зводнага каталогу Магілёўскай бібліятэкай адкрывае шырокія магчымасці выкарыстання яго іншымі бібліятэкамі, мадэлюючы храналагічныя перыяды і моўныя параметры.

Даныя органаў бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі паказваюць памяншэнне выпуску галіновых і тэматычных краязнаўчых паказальнікаў. Але фіксуюць павялічэнне выпуску грунтоўных біябібліяграфічных дапаможнікаў, што сведчыць аб важнасці персанальнага аспекту краязнаўчых ведаў. Сярод іх выдадзены дапаможнікі, якія адлюстроўваюць персаналіі за ўвесь гістарычны перыяд, дапаможнікі, у якіх склад персаналій абмежаваны гістарычным перыядам, падзеяй, галіной творчай, прафесійнай і навуковай дзейнасці, родам заняткаў. Апошнія з'яўляюцца неад'емным элементам бібліяграфічных рэсурсаў галін краязнаўства (галіновую афарбоўку маюць назвы такіх дапаможнікаў). Да лепшых належаць біябібліяграфічны слоўнік Светлагорскай ЦГБ "Земляки: История Светлогорска в лицах" (3881 (2001 г.)); паказальнік Магілёўскай абласной бібліятэкі "Дзеячы архітэктуры і выяўленчага мастацтва Магілёўшчыны" (3473 (2005 г., ч. 1)). Аналіз дадзеных бібліяграфічных прац сведчыць аб іх высокай якасці, аб умелым выкарыстанні складальнікамі метадычных навацый, аб майстэрстве бібліяграфічнага і фактаграфічнага пошуку.

Біябібліяграфічны слоўнік Светлагорскай ЦГБ "Земляки: История Светлогорска в лицах" (3881 (2001 г.)), створаны на аснове БД "Знаменитые люди города". З метадычнага пункту гледжання дапаможнік заслугоўвае высокай ацэнкі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з'яўляецца інавацыйным прадуктам. У прыватнасці, для выяўлення асоб і біяграфічных даных праведзена вялікая пошукавая работа, сабраны даныя з друкаваных крыніц, выкарыстана інфармацыя, прадстаўленая аддзеламі кадраў прадпрыемстваў і ўстаноў горада, музеем гісторыі Светлагорска, матэрыялы перапіскі і вусныя звесткі, атрыманая падчас асабістых сустрэч з вядомымі людзьмі складальніцы слоўніка Г. І. Захаранка. Дапаможнік stationоўча вызначаецца якасцю прадмовы, інфармацыйнай насычанасцю, акцэнтаваннем увагі на ролі чалавека ў жыцці горада – што ўдаецца не ўсім стваральнікам падобнай прадукцыі. Шэраг даведак упершыню прадстаўляюць звесткі аб асобе ў выглядзе дакументаванага тэксту. Усе групы бібліяграфуемых матэрыялаў і крыніц інфармацыі дакладна структурыраваны, дадаткова маркіруюцца ўмоўнымі знакамі. Біябібліяграфічны даведнік якасна аформлены: афсетны друк, шмат вершаваных эпіграфаў, партрэтныя, групавыя і відавыя фотаздымкі гараджан і г. Светлагорска. Светлагорскай ЦГБ створаны ўзор каштоўнай крыніцы ведаў і інфармацыі, з дапамогай якой магчыма пераадолець рассеянасць персаналій, існуючую як у дакументным патоку, так і ў сістэматычных карткавых краязнаўчых картатэках.

У біябібліяграфічным паказальніку "Дзеячы архітэктуры і выяўленчага мастацтва Магілёўшчыны" (3473 (2005 г., ч. 1)), падрыхтаваным аддзелам мастацтва абласной бібліятэкі, уключаны звесткі аб 377 асобах. Матэрыял размеркаваны ў двух раздзелах паводле прафесійнай прыналежнасці, унутры – у алфавітным парадку. У біяграфічных даведках прыведзены звесткі аб месцы нараджэння і жыхарства, адукацыі, членстве ў творчых саюзах, назвы створаных архітэктурных праектаў і мастацкіх твораў, узнагародах і інш. Спісы літаратуры аб творцах уключаюць розныя віды дакументаў з фондаў Магілёўскай абласной бібліятэкі. У канцы змешчаны спісы прафесійных і непрафесійных мастакоў, аб якіх яшчэ няма публікацый (28 асоб). Дапаможнік суправаджаецца імянным і геаграфічным (аб’екты з біяграфічных даведак) дапаможнымі паказальнікамі. Павысіць краязнаўчае значэнне выдання маглі б дапаможныя паказальнікі геаграфічных аб’ектаў Магілёўшчыны і персаналій, адлюстраваных у творах мастацтва.

Сучаснаму складу членаў Віцебскага абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў прысвечаны даведнік "Пісьменнікі Віцебшчыны", выдадзены пад рэдакцыяй сакратара арганізацыі Ф. І. Сіўко. Даведнік вызначаецца ўдалай структурай: у раздзеле "Пісьменнікі – ураджэнцы Віцебшчыны" (4179 (2002 г.)) у алфавіце раёнаў змешчаны прозвішчы пісьменнікаў з указаннем даты і месца нараджэння; у раздзеле "Літаратары Віцебшчыны: дзень сённяшні" – у алфавітным парадку біяграфічныя і бібліяграфічныя матэрыялы аб іх. Сярод біяграфічных даведак вылучаюцца аўтабіяграфіі пісьменнікаў, у якіх фактаграфічны матэрыял прасякнуты эмацыянальна-вобразным апісаннем. Уключаны звесткі аб іншых літаратурных суполках і літаратурных музеях края. Да біяграфічных даведак складзены спісы твораў, у якіх на першым месцы кніжныя выданні. Асобныя публікацыі сгрупаваны ў храналагічнай паслядоўнасці. На жаль, паэтычныя жанры апісаны пад найменнем "Вершы" (з спасылкай да біябібліяграфічнага слоўніка "Беларускія пісьменнікі"), а таксама не адлюстраваны крытычныя матэрыялы.

Краязнаўчы характар маюць многія дапаможнікі, прысвечаныя вучоным, выкладчыкам ВНУ, мясцовым арганізацыям і ўстановам, якія звычайна разглядаюцца ў складзе галіновых бібліяграфічных рэсурсаў. Уключэнне ў такія дапаможнікі структурных падраздзяленняў з бібліяграфічнымі запісамі аб саміх дзеячах і ўстановах, што назіраліся ў разглядаемы перыяд, павялічыла іх ролю як крыніц краязнаўства. Вельмі пажадана, каб на гэты аспект звярнулі ўвагу бібліёграфы як пры падрыхтоўцы, так і пры выкарыстанні бібліяграфічнай прадукцыі (натуральна, што ён добра адлюстраваны ў дапаможніках, прысвечаных даследчыкам края). Мэтазгодна ў тэкставых (біяграфічныя даведкі, артыкулы, успаміны),

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічных (спісы літаратуры аб жыцці і дзейнасці) і ілюстрацыйных матэрыялах (фотаздымкі) акцэнтаваць дасягненні чалавека ў непарыўнай сувязі з яго укладам у развіццё данай установы, горада, рэгіёна. Такія метадычныя прыёмы ўдала выкарыстаны ў паказальніку "Прафесар Мікалай Васільевіч Абабурка" (3560 (2001 г.)) Магілёўскай абласной бібліятэкі і інш.

Метадычна персанальныя дапаможнікі насычаны фактаграфічнымі і бібліяграфічнымі матэрыяламі, што абумоўлівае складанасць іх структуры, многія добра аформлены. Адметнасцю персанальных дапаможнікаў у параўнанні з іншымі з'яўляецца павялічэнне ўвагі да адлюстравання краязнаўчай фактаграфічнай інфармацыі. Біяграфічныя даведкі ў лепшых папулярных і навукова-дапаможных паказальніках адрозніваюцца прызначэннем, аб'ёмамі звестак і моўна-стылістычнымі асаблівасцямі, што адпавядае метадычным патрабаванням. Але не заўсёды ў біяграфічных даведках акцэнтуецца ўвага на ўласна краязнаўчай дзейнасці персаналій. Пажадана канкрэтызаваць асобныя даты ў распаўсюджаных у гэтых дапаможніках "Асноўныя даты жыцця і дзейнасці". Хронікі змяшчаюць, як правіла, толькі ўказанне гадоў, тады як для групы дат, якія заслугоўваюць большай канкрэтызацыі, напрыклад, зусім не сустракаюцца буйнейшыя даты сямейнага жыцця, а гэта адзін са шматлікіх аспектаў адлюстравання сувязяў чалавека з мясцовасцю і часам з установай (шлюб з супрацоўніцай, сумесная праца з прадстаўнікамі сям'і ці роднымі). Такая методыка можа прынесці карысць у адлюстраванні працоўнага, навуковага, творчага і асабістага лёсу асобы ў сувязях з месцам працы і жыхарства.

Шэраг разгледжаных бібліяграфічных дапаможнікаў патрабуюць паляпшэння рэдагавання, у прыватнасці якасці прадмоў, бібліяграфічнага апісання і дапаможных паказальнікаў. Для самастойных краязнаўчых бібліяграфічных выданняў бібліятэк застаецца актуальным пытанне павышэння тыражу. Арыгінальныя і карысныя дапаможнікі выпускаюцца тыражом 5–10 экзэмпляраў, з-за чаго становяцца бібліяграфічнымі рэдкасцямі і надзвычай абмяжоўваецца іх выкарыстанне. Таксама неабходна адзначыць, што ў паказальніках бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі не адлюстроўваюцца шматлікія краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі многіх бібліятэк краіны, уключаючы ЦБС.

Выключнае значэнне ў разглядаемы перыяд набылі несамастойныя бібліяграфічныя матэрыялы, змешчаныя ў манаграфіях краязнаўчага зместу, гісторыка-дакументальных хроніках гарадоў і раёнаў Беларусі "Памяць" (4040–4052 (2001 г.), 4454–4460 (2002 г.), 4782–4791 (2003 г.), 5473–5485 (2004 г.), 4000–4017 (2005 г., ч. 1)), выданнях гістарычных дакументаў і матэрыялаў ("Хроніка Убарцкага Палесся" / Аўт.-уклад. А. І. Атнагулаў (4251 (2002 г.)) і інш.), зборніках навуковых канферэнцый, вучэбнай літаратуры па рэгіёназнаўчых курсах для ВНУ, краязнаўчых перыядычных выданнях, часопісах нацыянальна-культурных таварыстваў і інш. Паток гэтых выданняў значны, тэматыка публікацый разнастайная. Адсочваць па іх матэрыялы, прысвечаныя канкрэтным тэрытарыяльным аб'ектам складана і нярэдка патрабуецца дапрацоўваць бібліяграфічныя запісы, але несамастойныя бібліяграфічныя матэрыялы адлюстроўваюць карпатліва выяўленыя публікацыі, у т. л. замежныя, неапублікаваныя дакументы, без якіх нельга наладзіць інфармацыйнае забеспячэнне рэгіянальных даследаванняў, асабліва па вузкіх пытаннях і новых тэмах. Пры недахопе звестак аб персаналіях і па тэмах умелае выкарыстанне несамастойных форм дазваляе ўзбагаціць краязнаўчыя бібліяграфічныя рэсурсы бібліятэк і ўдасканаліць даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ